**УДК 021.4(476.5)**

# ТРАНСЛЯЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК НА ПРЫКЛАДЗЕ ЎСТАНОЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***К.В. АНДРЭЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Разглядаецца феномен трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны публічнымі бібліятэкамі Беларусі на прыкладзе шэрагу ўстаноў Віцебскай вобласці. Актуальнасць пытання абумоўлена даследваннем формаў і метадаў працы, прымяненне якіх спрые фарміраванню цікавасці да знаёмства і вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Вынікі сацыялагічнага даследвання падкрэсліваюць неабходнасць дасканалага стаўлення да праблемы. Зроблен акцэнт на інавацыйных метадах прэзентацыі нацыянальнага здабытку. Атрыманыя высновы адлюстроўваюць эфектыўнасць пазіцыянавання спадчыны Беларусі ў дзейнасці сельскіх і гарадскіх публічных бібліятэк.*

***Ключавыя словы**: краязнаўства, бібліятэка, папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны, сацыяльна-педагагічны аспект.*

**Уводзіны.** За сваю шматвяковую гісторыю Рэспубліка Беларусь атрымала багатую спадчыну, прадстаўленую матэрыяльнымі і нематэрыяльнымі каштоўнасцямі, якія маюць навуковую, культуралагічную і эстэтычную значнасць. Духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці, дасканала захаваныя і памножаныя, з'яўляюцца ўмовай дынамічнага развіцця грамадства і дзяржавы. Захаванне і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны дазваляе выхаваць у падрастаючым пакаленні духоўнасць, маральнасць, патрыятызм. Пазнанне гісторыка-культурнай спадчыны, якая з'яўляецца часткай нацыянальнага здабытку, выступае неабходнай умовай для інтэлектуальнага, духоўнага станаўлення асобы. Агульнанацыянальныя каштоўнасці генеруюць высокую ступень нацыянальнай самасвядомасці і самаіндэфікацыі, светаўспрыманне, уплываюць на ўсталяванне сувязі паміж пакаленнямі. Дзяржава бярэ на сябе функцыю гаранта ў пытанні захавання, папулярызацыі і памнажэння нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб Культуры ад 20 ліпеня 2016 г. рэгулюе грамадскія адносіны па ўстанаўленню арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый стварэння, захавання, распаўсюджвання і папулярызацыі твораў матэрыяльнай і духоўнай культуры, па захаванню і перадачы культурных традыцый. Галоўная мэта заключаецца ў адраджэнні і развіцці беларускай нацыянальнай культуры і культур нацыянальных супольнасцей Беларусі як складовай часткі агульначалавечай культуры; фарміраванні культурнага асяроддзя, маральных пачаткаў, эстэтычных поглядаў і густаў народа і далучэння яго да мастацкай творчасці, да гуманістычных каштоўнасцяў культуры [8].

**Асноўная частка**. Сёння многія сацыяльныя інстытуты краіны ў той ці іншай ступені акцэнтуюць увагу на пытанні папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, у іх ліку сістэма ўстаноў адукацыі, рэлігійныя ўстановы, музеі, бібліятэкі і інш.

Бібліятэка як сацыякультурнае асяроддзе ўяўляе сабой не толькі сховішча дакументальнага здабытку краіны, але і з'яўляецца рэалізатарам шматлікіх функцый, у тым ліку сацыяльна-педагагічнага характару. Даследчыкі вылучаюць наступныя функцыі: інфармацыйную, выхаваўчую, адукацыйную і арганізацыйную [3, с. 10]. Відавочна, што патрэбы сучаснага карыстальніка інфармацыяй бібліятэка задаволіць не можа. Дадзеная акалічнасць абумоўлена некалькімі з'явамі: востра стаіць праблема нецікавасці да чытання, састарэлыя метады арганізацыі пошуку інфармацыі, нязначная мадэрнізацыя і недастатковае фінансаванне. Падобная сітуацыя назіралася з сістэмай айчыннага відэапракату і дзейнасці кінатэатраў. Састарэлыя тэхналогіі больш не маглі адказваць інтарэсам спажыўца. І толькі мадэрнізацыя сферы ў цэлым, а менавіта ўкараненне 3D, 5D-тэхналогій з «эфектам прысутнасці», дазволіла вярнуць гледача. Гульня з успрыманнем рэальнасці, сінхранізацыя спецэфектаў і імітацыя руху дае магчымасць гледачу стаць не проста пасіўным назіральнікам таго, што адбываецца на экране, але і актыўным удзельнікам падзей.

Ва ўмовах інфармацыйнага грамадства і шырокага захаплення падрастаючага пакалення здабыткамі татальнай інфарматызацыі актуальна прапанаваць такую форму пазнання гісторыка-культурнай спадчыны краіны, якая стымулявала бы ўстойлівую цікавасць, садзейнічала самаадукацыі, павышала прывабнасць да прафесійнай гістарычнай навукі, натхняла на даследчыцкі пошук. Інстытут адукацыі ставіць перад сабой задачу пошуку аптымальнай стратэгіі фарміравання ў маладога пакалення арыенціраў для грамадзянскай, нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, спасціжэння культурных, этычных, маральных каштоўнасцяў. На сучасным этапе даволі актуальна пытанне фарміравання і прасоўвання нацыянальнага турыстычнага прадукту, пабудовы станоўчага іміджу краіны на знешнім рынку, аднак не

варта забываць і аб даступнасці і прывабнасці інфармацыі, актуалізацыі ўвагі да гісторыі і культуры сваёй Радзімы. Багатая гісторыка-культурная спадчына, унікальная і самабытная традыцыйная культура могуць быць незаслужана забытыя і сцёртыя з свядомасці падрастаючага пакалення, у тым выпадку, калі своечасова не надаць гэтаму пытанню належнай увагі.

Дзейнасць публічных бібліятэк вызначаецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб Культуры ад 20 ліпеня 2016 г., а таксама Статутам дзяржаўнай установы культуры, зацверджаным для кожнай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. Згодна з унутранымі распарадчымі дакументамі бібліятэка павінна ажыццяўляць дзейнасць па такіх напрамках, як фарміраванне прававой адукацыі, экалагічная асвета, прапаганда здаровага ладу жыцця, сямейнае, эстэтычнае, патрыятычнае выхаванне, краязнаўства, а таксама прапаганда беларускай літаратуры, мовы, культуры, адраджэнне нацыянальных традыцый і г. д. Краязнаўчая дзейнасць уключае ў сябе фондавую, бібліяграфічную, выдавецкую, выставачную і сацыякультурную працу. Дадзеныя напрамкі работы бібліятэкі дазваляюць прэзентаваць інфармацыю для шырокага чытацкага кола [1, с. 22].

Бібліятэчныя ўстановы краіны надаюць увагу вывучэнню лакальнай, рэгіянальнай гісторыі, краязнаўству і прыцягненню ўвагі дзяцей і падлеткаў. Дадзены кірунак дзейнасці прадстаўлены наступнымі формамі метадычнай працы: краязнаўчыя гурткі, гісторыка-патрыятычныя клубы і г. д. Найбольш актуальнай формай камунікацыі паміж бібліятэкай і чытачом з'яўляюцца відэапрэзентацыі, тэматычныя гасцёўні, віктарыны, гульні-квэсты, творчыя майстэрні, кніжныя выставы, этнаграфічныя куткі і г. д. [5, с. 23].

Бібліятэка як сацыякультурны інстытут бярэ на сябе задачы сацыяльна-педагагічнага і выхаваўчага характару. Зыходзячы з класіфікацыі Р. С. Матульскага прынята вылучаць наступныя сацыяльныя функцыі бібліятэк: садзейнічанне адукацыі і выхаванню, інфармацыйнае забеспячэнне навукова-вытворчай дзейнасці, культурную. Кожная з названых функцый можа выступаць у якасці дамінуючай па параўнанні з астатнімі ў канкрэтнай бібліятэцы. Сацыяльна-педагагічная функцыя прадстаўлена наступнымі напрамкамі: адукацыйны, выхаваўчы, навучальны, асветніцкі, функцыя самаадукацыі і інш. Сэнс адукацыйнай функцыі даследчык бачыць у тым, што «бібліятэкі, садзейнічаючы розным відам адукацыі чытачоў, спрыяюць павышэнню іх культурнага ўзроўню, духоўнаму ўзбагачэнню чалавека, выхаванню навуковага светапогляду, умацаванню пазнавальнай цікавасці». Дзейнасць бібліятэкі грунтуецца на дасканалай метадычнай працы. Адным з такіх напрамкаў з’яўляецца выставачная дзейнасць [7, с. 54].

Выставачная зона з'яўляецца тым локусам у прасторы бібліятэкі, якая фармуе першае ўражанне і прыцягвае ўвагу да тэматыцы экспануемых матэрыялаў. Веданне асноўных законаў візуальнага ўспрымання і творчы падыход да вырашэння праблемы дазваляюць дасягнуць максімальнага эфекту. Даволі часта інтэр'ер бібліятэк з'яўляецца спадчынай савецкіх часоў. І толькі творчы падыход у афармленні выставачных стэндаў і тэматычных куткоў дазваляе прыцягнуць увагу чытачоў. Згодна з каляндарна-тэматычным планаваннем у дзейнасці бібліятэкі афармленне выставачных стэндаў прысвячаюць жыццю і творчасці выдатных пісьменнікаў, паэтаў; каляндарным датам; тэме фарміравання асноў здаровага ладу жыцця, патрыятычнаму, маральнаму, эстэтычнаму выхаванню, прывіццю экалагічнай культуры, гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі. Аднак, якім бы камфортным не было прасторавае асяроддзе чытача, пытанне прывіцця цікавасці да чытання застаецца актуальным. Як адзначаў вядомы педагог Л. С. Выгоцкі: «Устойлівая цікавасць да чытання можа быць сфарміравана толькі ў тым выпадку, калі дзіця пастаянна акружана кнігамі і людзьмі, якія чытаюць» [2, с. 99].

Не менш актуальнае пытанне не толькі прывабнасці бібліятэкі як інфармацыйнага і сацыякультурнага інстытута, але і чытання. Сацыялагічнае даследаванне, якое насіла характар анкетавання, выявіла наступную тэндэнцыю: рэспандэнты ва ўзросце 15–18 гадоў (46%), ва ўзросце 19–22 (41%) выказаліся, што бібліятэку наведваюць рэдка, 24% не наведваюць і карыстаюцца паслугамі інтэрнэту. У анкетаванні прынялі ўдзел 62 чалавекі. 36 (54% апытаных) дзяўчыны і 26 (46%) юнакоў. 30 чалавек (51%) ва ўзросце 13–17 гадоў, 18 (29%) ва ўзросце 18–20 гадоў, 14 (20%) 20–22 гадоў. Адказы на першае пытанне выявілі наступныя дадзеныя «Ці наведваеце Вы бібліятэкі і як часта?» 25 чалавек (31%) выбралі варыянт «1 раз у месяц», 15 (24%) – «часам», 14 – (17%) «ніколі». На пытанне «З якой мэтай Вы наведваеце бібліятэку» атрыманы наступныя адказы: «Пошук дакумента, кнігі» 13 (34%) чалавека «Скарыстацца паслугамі копірайтэра» – 43 чалавека (61%), «Удзел у бібліятэчных мерапрыемствах» 6 чалавек (5%).

Наступнае пытанне датычылася матывацыі: «Прычына, па якой Вы НЕ наведваеце бібліятэку, альбо робіце гэта рэдка?» вызначылася наступнымі адказамі: 30 чалавек (47%) выбралі «Не прывучаны з дзяцінства да наведвання бібліятэк», 33 чалавека (54%) – «Не люблю чытаць», 27 чалавек (44%) – «Зручны пошук інфармацыі ў інтэрнэце», 8 чалавек (11%) – «Не маю часу». На пытанне «Якія формы работы былі б цікавыя Вам?» атрыманы адказы: «Гульні-квэсты» 34 чалавек (54%), «Майстар-класы па традыцыйных рамёствах» 14 чалавек (23%), «Відэа-экскурсіі па гістарычных мясцінах» 14 чалавек

(23%). Сярод прапаноў з боку рэспандэнтаў у пытанні паляпшэння якасці і прывабнасці бібліятэчнага абслугоўвання былі адзначаны наступныя: мастацкае афармленне інтэр'еру бібліятэкі (фота кніг, заніраванне чытальнай прасторы), правядзенне інтэрактыўных мерапрыемстваў, супрацоўніцтва з навучальнымі ўстановамі (каледж, універсітэт).

Такім чынам, сам факт прыцягнення падрастаючага пакалення ў бібліятэкі з'яўляецца актуальным напрамкам у дзейнасці устаноў. Разам з тым з боку бібліятэк распрацоўка і прымяненне мэтавых праграм будуць акцэнтаваць увагу чытача на пэўных аспектах дзейнасці бібліятэкі. Падрастаючае пакаленне з'яўляецца тым патэнцыялам, на які павінна быць звернута пільная ўвага. Яркае, вобразнае афармленне тэматычных куткоў і выстаў, перадавыя педагагічныя інавацыі здольныя прыкаваць увагу чытача, прывіць цікавасць да далейшага наведвання бібліятэчных устаноў і цеснай працы з кнігай.

Прэзентацыя гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку традыцыйнай культуры, на базе бібліятэкі ва ўмовах сучаснага соцыуму павінна насіць сістэматычны, паслядоўны характар з выкарыстаннем крэатыўных і інавацыйных метадаў.

Даследуючы праблематыку папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны ў цэлым і традыцыйнай культуры ў прыватнасці, гарадскімі і сельскімі публічнымі бібліятэкамі былі вывучаны планы прац Верхнядзвінскай, Браслаўскай, Полацкай, Шумілінскай, а таксама Наваполацкай цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм (далей ЦБС). Увага звярталася на такія аспекты дзейнасці, як вядзенне краязнаўчых картатэк і баз дадзеных, выдавецкую і выставачную дзейнасць, наяўнасць мэтавых праграм па краязнаўстве і адраджэнню традыцыйнай культуры, дзейнасці краязнаўчых і гісторыка-патрыятычных клубаў, правядзенні тэматычных мерапрыемстваў, наяўнасці на базе бібліятэкі этнаграфічнай экспазіцыі (табл. 1.).

**Табліца 1. – Колькасныя паказчыкі папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны ў дзейнасці бібліятэк Верхнядзвінскага, Браслаўскага, Полацкага, Шумілінскага раёнаў і г. Наваполацка за 2016-2017 гг.**

| Назва раёну | Колькасць бібл. і філіялаў | Колькасць мэтавых праграм па краязнаўству, адраджэнню традыцыйнай культуры | Наяўнасць краязнаўчых, гісторыка-патрыятычных, клубаў для розных катэгорый насельніцтва | Наяўнасць этнаграфічнага кутка пры бібліятэцы |
|---|---|---|---|---|
| Верхядзвінскі р-н | 19 | 4 | – | – |
| Браслаўскі р-н | 17 | 8 | 4 | 5 |
| Шумілінскі р-н | 19 | 5 | 5 | 2 |
| Полацкі р-н | 35 | 8 | 2 | 1 |
| г. Наваполацк | 7 | 3 | 2 | – |

Спецыялізацыя бібліятэкі на пэўных кірунках сваёй дзейнасці знаходзіць адлюстраванні ў распрацоўцы мэтавых праграм. Галоўная місія падобных дакументаў заключаецца ў актуалізацыі ролі бібліятэкі па папулярызацыі кніг краязнаўчага характару; садзейнічанні захаванню духоўнай спадчыны беларускага народа, выхаванню патрыятызму і гонару за сваю Радзіму. Задачы праграм засяроджаны на наступных напрамках: выяўленне і сістэматызацыя краязнаўчых, гістарычных матэрыялаў, арганізацыя бібліяграфічнага і інфармацыйнага забеспячэння чытачоў па тэме мэтавай праграмы, павышэнне агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню чытачоў, папулярызацыя беларускай мовы і літаратуры, каардынацыя працы з музеямі, Дамамі культуры, рамёстваў, грамадскімі аб'яднаннямі і арганізацыямі, фарміраванне этнаграфічных куткоў пры бібліятэцы, каардынацыя дзейнасці краязнаўчых, гісторыка-патрыятычных клубаў і гурткоў.

Верхнядзвінская, Браслаўская, Полацкая, Шумілінская, а таксама Наваполацкая цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы (далей ЦБС) складаюцца з цэнтральнай бібліятэкі і філіялаў. Так, у Верхнядзвінской ЦБС налічваецца 19 бібліятэк, 4 з якіх працуюць па мэтавых праграмах, варта адзначыць, што 1 рэалізуецца ў Верхнядзвінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ім. Г. Хадкевича, іншыя – у Нураўскай, Валынецкай сельскіх філіялах, а таксама ў Асвейскай горпаселковай бібліятэцы № 2 ім. В. Рудага.

Браслаўская ЦБС прадстаўлена 17 бібліятэкамі. Мэтавыя праграмы па краязнаўстве і адраджэнню традыцыйнай культуры прадстаўлены ў цэнтральнай бібліятэцы г. Браслава, Богінскім, Друеўскім, Іказненскім, Мяжанскім, Плюскім, Пагасчанскім, Іказненскім філіялах.

Шумілінская ЦБС налічвае 19 бібліятэк. Мэтавыя праграмы функцыянуюць у Дабейскай, Кардонскай, Лаўжанскай, Мішкоўскай і Язвінскай сельскіх бібліятэках.

Полацкая ЦБС складаецца з 35 бібліятэк. Мэтавыя праграмы рэалізуюцца ў Полацкай цэнтральнай раённай бібліятэцы ім. Ф. Скарыны, бібліятэцы-філіяле № 2 ім. А. І. Герцэна, бібліятэцы-філіяле № 3 ім.

Я. Купалы, бібліятэцы-філіяле № 8, а таксама Гомельскай, Багатырскай сельскай бібліятэках, Шпакоўшчынскай сельскай бібліятэцы-клубе, Сільніцкай сельскай бібліятэцы-музеі этнаграфіі.

У Наваполацкую ЦБС уваходзіць 7 бібліятэк. Праблемамі адраджэння беларускай мовы і літаратуры займаюцца дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 ім. А. Пушкіна, цэнтральная бібліятэка ім. В. Маякоўскага пазіцыянуе сусветную гісторыка-культурную спадчыну, бібліятэка-філіял № 8 у г.п. Баравуха мае гісторыка-патрыятычны кірунак.

У рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Год культуры» (2016 г.) Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай Браслаўскага раёна была распрацавана мэтавая праграма па адраджэнню нацыянальнай культуры і краязнаўства. Мэтай дадзенай праграмы з'явілася актывізацыя дзейнасці бібліятэк у пытанні прапаганды гісторыі, традыцый і культуры малой Радзімы. Асноўнымі сродкамі ў рэалізацыі праграмы выступілі наступныя аспекты: выяўленне і сістэматызацыя матэрыялаў па гісторыі Браслаўшчыны, арганізацыя экскурсій у этнаграфічныя куткі бібліятэк, папаўненне экспазіцый новымі прадметамі, фарміраванне бібліяграфічных і інфармацыйных рэсурсаў па тэме мэтавай праграмы, папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна шляхам арганізацыі кніжных выстаў, каардынацыя дзейнасці рэалізацыі праграмы з установамі адукацыі. Напрамкі краязнаўчага выхавання – гісторыка-краязнаўчы, грамадзянска-патрыятычны, літаратурны. Формы і метады рэалізацыі праграмы – тыдзень беларускай пісьменнасці і друку, тыдзень патрыятызму, тыдзень роднай мовы, гістарычнае падарожжа, гістарычная пляцоўка, гадзіна народных традыцый, экскурсія ў этнаграфічны куток, этнаграфічныя гульні [11].

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк накіравана на шырокі круг чытачоў, увага надаецца не толькі дзецям і падлеткам. Клуб «Я-палачанін» на базе бібліятэкі-філіяла ім. Герцэна г. Полацка сваёй дзейнасцю арыентаваны на сталую чытацкую аўдыторыю. Праграмы мерапрыемстваў утрымліваюць сустрэчы з гісторыкамі, краязнаўцамі, экскурсаводамі, майстрамі-рамеснікамі і г.д. Цеснае супрацоўніцтва з рэгіянальнымі цэнтрамі навукі, такімі як Полацкі дзяржаўны універсітэт, Нацыянальны полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, дае магчымасць трансляваць інфармацыю аб найноўшых дасягненнях у археалогіі, этнаграфіі, музейнай справе і нш. Так, неаднаразова гасцямі сустрэч былі Дз. У. Дук, У. А. Лобач, П. І. Мішын, В. І. Мішына, У. А. Арлоў, Т.А. Джумантаева і інш. [12].

Пошук інавацыйных падыходаў магчымы і ў традыцыйных метадах бібліятэчнай дзейнасці, прыкладам таму з'яўляецца выставачная дзейнасць. Аднак стэлаж з кнігамі хутчэй будзе праігнараваны, калі не выкарыстоўваць пэўныя тэхналогіі яго афармлення. Асаблівасцю выставачнай дзейнасці Шумілінскай раённай бібліятэкі з'яўляецца прымяненне ў выставачных стэндах не толькі кніг як экспанатаў, але і тэкстылю, дэкарацый, тэматычных атрыбутаў і г. д. Кніжная выстава пад назвай «Квітней, Беларусь» (2016 г.), прысвечаная Дню незалежнасці Рэспублікі Беларусь, візуалізуецца з дапамогай выкарыстання тэкстылю, экспанатаў, кветак, якія злучаюць выставачную кампазіцыю ў адзінае цэлае. Прысвячаючы выставу дэкаратыўна-прыкладному мастацтву, традыцыйным рамёствам Беларусі, выкарыстаны мастацкія ўзоры, вырабленыя з саломкі, дрэва, гліны. Такая падача матэрыялу дазваляе не толькі ўзбудзіць цікавасць да пазнання традыцыйнай культуры, але і паспрабаваць свае сілы ў майстэрстве вырабу прадметаў народнага побыту, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Так, падчас правядзення выставы, прысвечанай традыцыйным рамёствам Беларусі ў 2017 г., адбылася прэзентацыя творчых дасягненняў «Зіхаціць золатам саломка» майстра саломапляцення Наталлі Стержанковай. Знаёмства з галіновай літаратурай, удзел у майстар-класе дазваляе самым якасным чынам пазнаёміцца з вывучаемым матэрыялам. Падобныя мерапрыемствы праводзяцца і ў асяроддзі гарадскіх публічных бібліятэк. Так, на базе Наваполацкай ЦБС у 2016 г. прайшла выстава і майстар-клас «Матуліна лялька», на якой была прадстаўлена лялька не толькі як узор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прадмет з выключна ўтылітарнай функцыяй, але і як сакральны абярэг напоўнены глыбокім сімвалізмам [13].

Удалым эксперыментам ў пытанні папулярызацыі сусветнай культурнай спадчыны стала рэалізацыя мэтавых праграмах "Візуальная галерэя мастацтваў", "Свет мастацтва: прастора і час" на базе бібліятэкі ім. Маякоўскага, якая ўваходзіць у Наваполацкую цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму. Адзін з праектаў меў сваёй асновай дэманстрацыю аўдыёвізуальных матэрыялаў, мэтай якога з'яўлялася прэзентацыя сусветнай музейнай спадчыны, а таксама агляд турыстычных славутасцяў краін і рэгіёнаў: «Імгненне вечнасці: музеі свету», «Турызм – рамантыка душы: мультымедыя – экскурсіі» [13].

Праца па папулярызацыі традыцыйнай культуры ў шэрагу бібліятэк цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм рэалізуецца ў дзейнасці шматпрофільных аматарскіх аб'яднанняў і клубаў. Так, напрыклад, Полацкая цэнтральная бібліятэка ім. Ф. Скарыны ў рамках клуба «Фітатэрапія» прапануе лекцыі пра гаючыя ўласцівасці траў, паслугі фітабара, майстар-класы па вырабу традыцыйнай беларускай лялькі-матанкі («Скарбонкі», «Крупенечкі», «Траўніцы» «Пеленашкі», «Берагіні» і інш.), а таксама надае ўвагу традыцыйнаму беларускаму календару з акцэнтам на святкаванні Купалля, Сёмухі (Тройцы) [9].

Выкарыстанне такіх прыёмаў у педагагічнай рабоце бібліятэкі як «пазнанне-рух» рэалізуецца з дапамогай правядзення гульняў-квэстаў. У рамках арганізацыі цыклу мерапрыемстваў, прысвечаных памятнай даце святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, Цэнтральнай раённай бібліятэкай

ім. Францыска Скарыны г. Полацка была праведзена гульня-квэст арыентаванне – SkarynaVelaKvest. Гэта спартыўна-інтэлектуальная гульня ў межах гістарычнай часткі горада, маршрут быў прывязаны да такіх месцаў як помнік Францыску Скарыне, дзе ўдзельнік можа бачыць легендарнага першадрукара ў мантыі вучонага, помніка літары Ў, музея беларускага кнігадрукавання. Сродкам перамяшчэння быў абраны веласіпед [9].

Такім чынам, прэзентацыя гісторыка-культурнай спадчыны заклікае вырашыць некалькі задач: па-першае, з'яўляецца добрым стымулюючым асяроддзем для павышэння цікавасці як да чытання, так і спрыяе сацыялізацыі, аккультурацыі, па-другое, садзейнічае фарміраванню ўстойлівай цікавасці да гісторыі, краязнаўству, а па-трэцяе, закладвае асновы для далейшага спасціжэння нацыянальнага здабытку краіны з дапамогай выезду па турыстычных і экскурсійных маршрутах. Гэта акалічнасць павінна спрыяць падтрымцы ў развіцці ўнутранага турызму.

Актуальна пытанне дзейнасці бібліятэк (бібліятэк-клубаў) у сельскай мясцовасці, якія даволі часта з'яўляюцца адзінымі цэнтрамі асветы і арганізацыі вольнага часу, зносін на інтарэсах, месцам псіхалагічнай разрадкі.

Сацыяльна неадаптаваныя (інваліды, “складаныя” падлеткі і г. д.), маламаёмасныя грамадзяне, якія не маюць магчымасці выезду не толькі за мяжу з мэтай турызму, а таксама выезду на экскурсіі, набываюць выдатную магчымасць пазнаёміцца з культурна-гістарычнымі рэсурсамі раёна, рэгіёна, краіны.

Немалаважная праблема пашырэння спектру паслуг бібліятэкамі. Ключавым момантам з'яўляецца пытанне фінансавання. Асноўнымі крыніцамі выступаюць сродкі мясцовага бюджэту і сродкі саміх арганізацый. Гэта з'ява, у сваю чаргу, запавольвае фінансаванне праектаў. Узнікае аб'ектыўная складанасць у выкананні праграмы камп’ютарызацыі. Варта адзначыць, што, сучасная бібліятэка імкнецца ісці ў нагу з часам. Інфармацыйныя тэхналогіі адкрываюць новыя магчымасці для зносін з чытачом, у тым ліку з дапамогай віртуальнай прасторы (сацыяльныя сеткі). Карыстальнік мае магчымасць атрымаць онлайн-доступ да рэсурсаў бібліятэкі, да груп па інтарэсах. Такая форма работы мае перавагі, якія дазваляюць павялічыць чытацкую аўдыторыю, бо карыстальнікі дзеляцца інфармацыяй са сваім асяроддзем.

Такім чынам, перад сучаснай бібліятэкай стаіць шэраг задач: пашырэнне дыяпазону патэнцыйных спажыўцоў інфармацыйных паслуг; тэхнічнае пераасноснашчэнне бібліятэк; інтэрактыўныя метады работы з рознымі катэгорыямі насельніцтва; фарміраванне метадычнай базы; прыцягненне мэтавай аўдыторыі з дапамогай PR–кампаній; фарміраванне творчых майстэрняў на базе бібліятэк; інавацыйныя формы камунікацыі з чытачом (выязныя чытальныя залы, перасоўныя бібліятэкі).

**Высновы.** Сацыякультурную прастору Беларусі немагчыма ўявіць без дзейнасці бібліятэк, якія з'яўляюцца генератарамі сацыяльна-педагагічных і выхаваўчых задач. Бібліятэка – гэта інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр горада, рэгіёна, краіны. Пазнанне лакальнай, рэгіянальнай і глабальнай гісторыі з'яўляецца важным кампанентам у фарміраванні рознабакова развітой асобы, а ўсведамленне нацыянальнага багацця краіны спрыяе выхаванню пачуцця патрыятызму і любові да Радзімы. Сацыяльна-педагагічная і выхаваўчая прастора сучаснай бібліятэкі гэта полікампанентная і поліфункцыянальная сістэма. Падтрымліваючы і ўмацоўваючы статус сацыяльна значнага інстытута, неабходны пастаянны пошук інавацыйных метадаў работы з рознымі катэгорыямі насельніцтва. Татальная інфарматызацыя і камп'ютэрызацыя, дамінаванне інтэрнэт-рэсурсаў у свядомасці падрастаючага пакалення з'яўляюцца «бар'ерам» у вяртанні да друкаванага слова, бо пустыя залы бібліятэк могуць стаць пацвярджэннем дадзенай з'явы. Выхаванне цікавасці да чытання з'яўляецца доўгачасовым планамерны працэсам. Недапрацоўкі ў гэтым кірунку на ўзроўні дзіцячага садка, пачатковай школы могуць прывесці да немінуючых наступстваў. Аднак новыя задачы вылучаюць і новыя падыходы да іх вырашэння. Бібліятэка, з'яўляючыся адзінкай інстытута культуры, выступае кансалідуючай платформай для супрацоўніцтва розных сацыяльных інстытутаў, такіх як адукацыя, культура, эканоміка са спажыўцом інфармацыйных паслуг – чытачом. Бібліятэка заклікана задавальняць маральныя, эстэтычныя, культурныя патрэбы чалавека. Прапаганда гісторыка-культурнай спадчыны, знаёмства і вывучэнне гісторыі роднага краю, краіны ў сценах бібліятэкі магчымы дзякуючы сімбіёзу творчасці і чытання, тэматычных сустрэч, віктарын, гульняў-квэстаў, творчых майстэрняў. У такіх умовах магчыма знаёмства з традыцыйнымі рамёствамі, дапоўненае чытаннем навукова-папулярнай літаратурай і, як вынік, замацаванне атрыманых ведаў з дапамогай вырабу прадметаў дэкаратыўна-прыкладного мастацтва. Гурткова-клубная дзейнасць на базе бібліятэкі можа стаць дадатковым стымулам для яе наведвання і далучэння да гісторыі, культуры, мастацтва.

Гадавое каляндарна-тэматычнае планаванне ў абавязковым парадку змяшчае пералік мерапрыемстваў, якія прысвячаюцца мікрагісторыі рэгіёну. Распрацоўка бібліятэчных праектаў і мэтавых комплексных праграм спрыяе прафесійнаму мадэляванню дзейнасці і адкрывае новыя перспектывы. Аналіз мэтавых праграм і метадычных дакументаў дае падставу зрабіць высновы аб тым, што пытанню традыцыйнай культуры надаецца ўвага ў большай ступені ў раённых і сельскіх філіялах бібліятэк, у тым

ліку, дзе прысутнічае пастаянная тэматычная экспазіцыя. Праектаванне выставачных экспазіцый, якія адлюстроўваюць традыцыйны ўклад жыцця, уключае ў сябе аб'екты духоўнай культуры і нематэрыяльнай спадчыны, якія, у сваю чаргу, увасабляюцца ў правядзенні народных святаў традыцыйнага народнага календара беларусаў. Генерацыя аб'ектаў матэрыяльнай культуры з утылітарнай і сакральнай сферы больш даступна ў сельскім асяроддзі. Культурна-адукацыйная прастора бібліятэкі, дапоўненая музейнымі артэфактамі, пашырае сваю функцыянальную сутнасць. Аднак варта адзначыць, што такая праца не з'яўляецца ўсеабдымнай, бо толькі асобныя бібліятэкі галоўнай сваёй місіяй маюць прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны. Гарадскія цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы першачарговай сваёй мэтай маюць прапаганду прававой адукацыі, экалагічнай і эстэтычнай культуры. Дадзеную з'яву можна растлумачыць тым, што ўмовы сучаснага горада актуалізуюць новыя напрамкі ў дзейнасці бібліятэк.

У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі на 2016–2020 г.» перад бібліятэкамі ставіцца задача павелічэння колькасці наведванняў публічных бібліятэк, у тым ліку выдаленымі карыстальнікамі. У межах партнёрства з аб'яднаннямі і арганізацыямі відавочна пытанне павышэння ўвагі да такіх катэгорый насельніцтва, як сацыяльна-неадаптаваныя грамадзяне, “складаныя” падлеткі, і г. д. Рэалізацыя дадзенага кірунку заклікана садзейнічаць сацыялізацыі, акультурацыі, творчай самарэалізацыі, пашырэнню кола інтарэсаў і культурных патрэбаў розных катэгорый насельніцтва.

ЛІТАРАТУРА


1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб Культуры ад 20 ліпеня 2016 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http// www.pravo.by . – Дата доступа: 10.07.2017 г.
2. Громова, О.К. Развитие информационной культуры у детей в школьных и детских библиотеках / О.К. Громова. – СПб. : Профессия, 2009. – 208 с.
3. Ванеев, А.Н. Библиотечное дело. Теория. Методика. Практика / А.Н. Ванеев ; СПбГУКИ. – СПб. : Профессия, 2004. – 368 с.
4. Мамонтов, А.В. Краеведческая библиография / А.В Мамонтов, Н.Н. Щерба. – М. : Книжная палата, 1989. – 215 с.
5. Мотульский, Р.С. Библиотека как социальный институт / Р.С. Мотульский. – Минск: Бел. гос. ун-т культуры, 2002. – С. 3–7, 13–230, 232–278, 332– 374.
6. Выготский, Л.С. Собрание сочинений : в 6 т. / Л.С. Выготский ; гл. ред. А.В. Запорожец. – М. : Педагогика, 1982–1984. – Т. 4 : Детская психология / под. ред. Д.Б. Эльконина. – 1984. – 433 с.
7. Целевая программа по возрождению национальной культуры и краеведению на 2016–2017 гг. Друйской библиотеки-филиала №3 «Мой край – мае вытокі» Централизованной библиотечной системы Браславского района.
8. Целевая программа на 2016–2017 гг. Верхнедвинской центральной районной библиотеки имени Т. Хадкевича «Зямля, дзе пачаўся мой лёс».
9. Целевая программа по краеведению “Я-полочанин” библиотеки-филиала № 2 им. А. Герцена Полоцкой районной библиотечной системы.
10. Целевая программа на 2016–2018 гг. “Мир искусства: пространство и время” Центральной библиотеки им. В. Маяковского НЦБС
11. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с. : іл.
12. Мартыненко, И.Э. Понятие и состав историко-культурного наследия Республики Беларусь / И.Э. Мартыненко. – Гродно : ГрГУ, 2005. – 343 с.
13. План работы Полоцкой районной централизованной библиотечной системы на 2016–2018 гг.


*Поступила 13.09.2017*

**STREAM HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE OF BELARUS IN THE ACTIVITIES OF PUBLIC LIBRARIES ON THE EXAMPLE OF INSTITUTIONS OF VITEBSK REGION**

***K. ANDREICHYK***

*The article considers the phenomenon of translation's cultural and historical heritage and public libraries of Belarus by the example of several districts of the Vitebsk region. The relevance of the question due to the study forms and methods of work, the use of which contributes to the formation of interest to explore and study historical and cultural heritage of the country. The results of the survey emphasize the need for careful attitude to the problem. Problen emphasis on innovative methods of presentation of the national heritage. The findings reflect the effectiveness of positioning heritage of Belarus in the activities of rural and urban public libraries.*

***Keywords:*** *Local history, library, popularization of historical-cultural heritage, socio-pedagogical aspect.*